Выходзіць з верасня 1995 года

Газета Уладзіміра Кудзінава

СУБОТА № 1
9 верасня 1995 года

Цана ў розніцу 720 руб.

СЛОВА ДА ЧЫТАЧОЎ

Паважаныя чытачы! Сёння вы трымаеце ў руках першы нумар „Газеты Уладзіміра Кудзінава". Гэта – незалежная грамадская газета. Для чаго яна створана, чаму носіць такую назву і якія мэты ставіць перад сабою? Напэўна, гэтыя пытанні вы хацелі б задаць нам. Адказваем.

Як вынікае з агульнавядомай ісціны, нічога, ніколі не ўзнікае без усялякай на тое прычыны. Напэўна, у нашым раёне наспела неабходнасць свабоднага слова, свабоднага выказвання думак і меркаванняў пра ўсё тое, што адбываецца ў жыцці. А адбываецца цяпер усяго шмат – і добрага, і дрэннага. Людзі прагнуць не толькі выжыць, але і жыць шчасліва, дастойна, з гонарам. І яны маюць права на такое жыццё, якое нельга пабудаваць без аб'ектыўнай інфармацыі па ўсіх пытаннях. Інфармацыі, якая будзе прымушаць думаць, супастаўляць, шукаць выйсце, працаваць.

Адразу тут чуем рэпліку: на чый жа млын вы будзеце ліць ваду? За камуністаў, калі ставіць пытанне што называецца ў лоб, ці за бэнээфаўцаў будзеце ратаваць? Каб і ў далейшым не ўзнікала такога пытання, скажам: для нас не мае ніякага значэння, да якой партыі ці руху належыць чалавек, якога веравызнання ён прытрымліваецца. Мы гатовы даць слова кожнаму з адзінай умовай: гаварыць пра ўсё спакойна, развážліва, без абраз і парушэнняў існуючых законаў. Такім чынам, наша газета – гэта газета здаровага сэнсу.

Але чаму яна носіць імя аднаго чалавека? Скажам шчыра: чалавек гэты – таленавіты гаспадарнік, фінансіст і эканаміст. Фірма, ...кую ён узначальвае, стала заснальнікам газеты. Імя, вынесенае ...агаловак яе, не столькі адно... да яго ўладальніка, колькі сім... ...уе права кожнага з нас ...нава, Іванова, Пятрова і г. ...свабоду думак, меркаван... ...янняў і ўчынкаў.


...е права і накладвае на ...ат абавязкаў, якія мы ...м проста і ясна: пісаць ...сіх, пісаць для ўсіх ...ьніцтва шчыра, ...іва. Аб'ектыў... ...акцыі газе... ...рэчы, пра... ...з вялікім ...урналіс... ...кі. Яны ...жыхары ...цікавую, ...незалеж... ...х указан...

...эакцыі ў ...ўйце па ...а. Мы ...рацоў...

...р ...ты ...міра ...нава".

Верасень, школа, дзеці





Фота А. КАНУНІКАВА.

Недзе палітыкі вядуць гарачыя дэбаты, рабочыя аб'яўляюць забастоўку, урачы робяць складаную аперацыю хвораму... Адбываецца шмат падзей – важных, неадкладных, якія вырашаюць лёс рэспублікі і нашага грамадства. Але вось прыходзіць верасень і галоўнай падзеяй, якая датычыцца літаральна ўсіх, становяцца заняткі ў школе. Датычыцца таму, што ў школу ідуць нашы дзеці, наша змена, наша будучыня і надзеі.

На жаль, пачатак заняткаў у школе азначае і абвастрэнне школьных праблем. Іх шмат. Гэта – і спадзяванні настаўнікаў на больш высокую зарплату, якая б адпавядала тым намаганням, якія яны затрачваюць. Гэта – і праблема метадычных дапаможнікаў, школьных падручнікаў. Гэта – і праблема харчавання школьнікаў, на якую хацелася б звярнуць асаблівую ўвагу і педагогаў, і бацькоў, і мясцовых уладаў, і грамадскасці. Дзеці павінны атрымліваць у школах ежу свежую, каларыйную, смачную, калі мы сапраўды клапоцімся аб іх здароўі, а гэта значыць аб здароўі беларускай нацыі.

Семдзесят працэнтаў. Гэтую лічбу з бадзёрай, нейкай пераможнай інтанацыяй абвяшчалі тэле- і радыёкаментатары ў навінах. 70 працэнтаў дзяцей-першакласнікаў будуць вучыцца ў школах з рускай мовай навучання. Незразумела толькі, навошта наогул збіралі такую статыстыку, незразумела, з якой нагоды бадзёрасць і пераможнасць у галасах. Што, гэтая лічба яшчэ раз падкрэслівае перамогу ўсіх тых, хто прагне навучання беларусаў на рускай мове? Перамогу над роднай мовай?

У СШ № 1 г. Івацэвічы чатыры першыя класы. Больш за сто дзяцей. Толькі трынаццаць дзетак бацькі пажадалі аддаць у рускамоўныя класы.

Вось ад гэтай лічбы – сапраўды радасць...

В. ГАПЕЕЎ.

СПОРТ

КЛУБ НАБІРАЕ АЧКІ

У мінулую суботу на стадыёне АТ „Івацэвічдрэў" адбылася сустрэча футбольных каманд горада Кобрына і спартыўнага клуба Кудзінава. Гульня была напружанай. Перамаглі футбалісты спартыўнага клуба Кудзінава з лікам 2:1.

Сёння футбалісты клуба сустракаюцца з камандай калгаса імя Чапаева на стадыёне вёскі Аброва. Гульня праводзіцца па плану чэмпіяната Брэсцкай вобласці сярод зборных футбольных каманд прадпрыемстваў, арганізацый, гаспадарак, гарадоў.

Л. ВАСІЛЬЕВА.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

ДА 25 ВЕРАСНЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ЧАЦВЁРТЫ КВАРТАЛ НА „ГАЗЕТУ УЛАДЗІМІРА КУДЗІНАВА". ХТО ЯШЧЭ НЕ ПАСПЕЎ ПАДПІСАЦЦА НА НОВУЮ ГАЗЕТУ, РАІМ ГЭТА ЗРАБІЦЬ НЕАДКЛАДНА.

КОШТ ПАДПІСКІ НА МЕСЯЦ – 3.300, НА КВАРТАЛ – 9.900 РУБЛЁЎ.

ПАЧЫНАЮЧЫ З КАСТРЫЧНІКА, ГАЗЕТА БУДЗЕ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ НА ТЫДЗЕНЬ. АДДАЎШЫ ПЕРАВАГ... ЁЙ, СПАДЗЯЁМСЯ – ВЫ НЕ ПАШКАДУЕЦЕ. БУДЗЬ... РАЗАМ.

НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ

АД СУБОТЫ ДА СУБОТЫ

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПАЧАЛА РАБОТУ

Больш за 30 пытанняў вынесена на разгляд сесіі беларускага парламента, якая адкрылася 5 верасня.

ПАЎТОРНЫЯ ВЫБАРЫ – 29 ЛІСТАПАДА

Цэнтральная камісія РБ па выбарах, правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў назначыла паўторныя выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета РБ трынаццатага склікання па выбарчых акругах, дзе дэпутаты яшчэ не выбраны, на 29 лістапада 1995 года.

Другі тур паўторных выбараў, калі гэта спатрэбіцца, пройдзе 10 снежня.

У нашым раёне паўторныя выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета пройдуць па дзвюх акругах: Івацэвіцкай № 20 і Косаўскай № 21.

ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА І ДРУКУ

3 верасня наша рэспубліка ў другі раз адзначыла Дзень беларускага пісьменства і друку. Асноўныя святочныя мерапрыемствы прайшлі ў старажытным Тураве. У наступным годзе яны пройдуць у Навагрудскім раёне.

ПРАФСАЮЗЫ НЕ ЗГОДНЫ

Прэзідыум федэрацыі прафсаюзаў звярнуўся да Прэзідэнта з просьбай пераглядзець свой указ № 336, а таксама ў Вярхоўны Савет і Канстытуцыйны суд з хадайніцтвам разгледзець пытанне аб адпаведнасці гэтага ўказа (прыпыненне дзейнасці асобных прафсаюзных арганізацый) заканадаўству РБ.

„ІНТЭГРАЛУ" БУДЗЕ ЛЯГЧЭЙ?

Прэзідэнт РБ А. Лукашэнка наведаў ВА „Інтэграл" – самае навукаёмкае прадпрыемства рэспублікі. Нагадаем – некалі „Інтэграл" быў вядучым прадпрыемствам у галіне мікраэлектронікі ў СССР. Ці верне ён свае заваёвы?

БЯДНЕЕМ, БРАТЦЫ, БЯДНЕЕМ

Вядомая аксіёма: жыццё становіцца больш заможным, калі даходы перавышаюць расходы. На жаль, у нас пакуль што наадварот. Як сведчыць Міністэрства статыстыкі і аналізу, грашовыя даходы, атрыманыя насельніцтвам у студзені–ліпені 1... года, павялічыліся ў параўн... студзенем–ліпенем 1994... раза пры росце спа... разоў.

Падлічыце с... ней сталі жы...



Калі мы гаворым сабе, што час – змяніўся, што жывем мы ў складаных умовах пераходнага перыяду да рынку, то ці заўсёды ўяўляем ступень пераменаў, ці заўсёды даём ім належную ацэнку? Напэўна, не заўсёды, бо чалавек ужо пабудаваны так, што ўсё добрае ўспрымае як належнае, а ўсё дрэннае перажывае востра і пакутліва. Сапраўды, сёння паўсюдна гавораць аб нізкіх заработках, беспрацоўі, хабарніцтве чыноўнікаў, злачыннай хвалі, іншых заганах грамадства. І неяк з боку, у цені застаюцца здабыткі, якія прынесла дэмакратызацыя, у тым ліку, магчымасць быць самому сабе гаспадаром ці прынамсі выкарыстоўваць гэтую магчымасць у адпаведнасці з сваімі фізічнымі і разумовымі здольнасцямі. У гэтым кантэксце адкрыццё новай газеты ў раёне – падзея. Падзея, якая не магла б адбыцца яшчэ літаральна некалькі гадоў назад. З дырэктарам гандлёва- прамысловай фірмы „Івацэвічы", якая і стала заснавальнікам „Газеты Уладзіміра Кудзінава", УЛАДЗІМІРАМ АЛЯКСЕЕВІЧАМ КУДЗІНАВЫМ гутарыць рэдактар новай газеты Л. ЦАЛУЙКА.

КОЛА ДУМАК

"ЛЮДЗІ ПАВІННЫ МЕЦЬ АБ'ЕКТЫЎНУЮ ІНФАРМАЦЫЮ..."

– Навошта гандлёва-прамысловай фірме, Вам, Уладзімір Аляксеевіч, асабіста газета?

– Калі гаварыць асабіста пра сябе, то праз новую газету я думаю рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права на свабоду слова. Але справа зусім не заключаецца толькі ў маёй асобе. Лічу, што сёння жыхары раёна пазбаўлены аб'ектыўнай інфармацыі аб усім тым, што адбываецца на прадпрыемствах, у арганізацыях, установах і гаспадарках. Працуе ці стаіць завод, працвітае ці знаходзіцца на мяжы банкрутства той ці іншы калгас, як ідзе прыватызацыя, як развіваецца дробны і сярэдні бізнес – на гэтыя і многія іншыя злабадзённыя пытанні чалавек часта не знаходзіць адказу. А між тым, людзі павінны мець аб'ектыўную інфармацыю аб усіх працэсах, якія адбываюцца і ў грамадстве, і ў эканоміцы. Мець для таго, каб неяк арыентавацца ў складаных сённяшніх умовах. Гандлёва-прамысловая фірма „Івацэвічы" таксама мае вострую патрэбу ў тым, каб пра яе пісалі і інфармавалі насельніцтва аб яе справах зыходзячы не з нейкіх чутак (часта не зусім чыстых), а з аб'ектыўнай рэальнасці.

– І ў чым жа заключаецца гэтая рэальнасць для ГПФ „Івацэвічы"?

– Сёння наша фірма – адно з магутных прадпрыемстваў не толькі ў раёне, але і ў Брэсцкай вобласці. У нас адкрыты, працуюць і абслугоўваюць пакупнікоў 20 магазінаў прадуктовых і прамысловых тавараў, ёсць падсобная гаспадарка ў вёсцы Гічыцы, дзе на адкорме знаходзяцца больш за 400 галоў буйной рагатай жывёлы і больш за 300 галоў свіней, цэх па вытворчасці каўбасных вырабаў, аўтазаправачная станцыя.

Аб'ектыўнай рэальнасцю з'яўляецца тое, што сёння фірма ўзяла на сябе клопат забяспечваць пакупнікоў раёна таварамі. І не толькі тымі, якія прыносяць прыбытак, але і тымі, якімі гандляваць не зусім выгадна. Гэта – запалкі і соль, шматлікія дробязі быту. Мы прапануем насельніцтву цяпер і малочныя прадукты, хлеб і булачныя вырабы, хаця гэта звязана з вялікімі транспартнымі расходамі. Трэба тут адразу заўважыць, што ў адрозненне ад магазінаў спажывецкай кааперацыі раёна гандлёвыя надбаўкі ў магазінах фірмы не перавышаюць 20 працэнтаў на прадуктовыя тавары і 30 працэнтаў – на прамысловыя тавары. Пакупнікі гэта ўжо добра засвоілі, у нашых прадаўцоў работы хапае. Дарэчы, імі працуюць маладыя, абучаныя фірмай кадры. Працоўная дысцыпліна сярод іх – высокая.

– Давайце спынімся на кадрах фірмы, яе калектыве...

– На сённяшні дзень калектыў фірмы налічвае 250 чалавек. Гэта – спецыялісты высокай кваліфікацыі. Праўда, многім давялося і мяняць сваю прафесію, павышаць кваліфікацыю. Не буду называць канкрэтных асоб, але скажу, што ў нас шмат людзей, якія штодня працуюць сумленна, станоўча зарэкамендавалі сябе. Вядома, людзі ў нас ведаюць за што працуюць – заработная плата з'яўляецца галоўным і пераканаўчым стымулам. Дарэчы, цяпер сярэднямесячны заработак у фірме ад 700 тысяч да 1 мільёна рублёў. Затрымак з выдачай зарплаты ў нас не бывае.

– Мне ўжо давялося бачыць у офісе фірмы чэргі людзей, якія прыйшлі на прыём да дырэктара з адзінай мэтай – папрасіцца на работу...

– На жаль, фірма не можа працаўладкаваць усіх жадаючых. За мінулы каляндарны год мы, аднак, стварылі прыкладна 150 дадатковых рабочых месц. Вось і для журналістаў і паліграфістаў у нас цяпер рабочыя месцы знайшліся.

– Гэта, напэўна, яшчэ раз сведчыць аб высокай фінансавай устойлівасці прадпрыемства, якое ў апошні час вядзе і вялікую дабрачынную дзейнасць.

– Так, мы маем магчымасць і неаднойчы праяўлялі дабрачыннасць для таго, каб аказаць грашовую дапамогу і школам, і бальніцы, і царкве, і проста асобным грамадзянам, у дзверы дамоў якіх пастукалася бяда. Нядаўна, напрыклад, адзін мільён рублёў быў выдзелены бацькам хворай дзяўчынкі-інваліда.

– Ці значыць усё гэта, што ў фірмы, як гаворыцца, няма праблем?

– Ну, праблем і ў нас хапае, ды такіх, якіх на дзяржаўным прадпрыемстве ці ў спажывецкай кааперацыі і ўзнікнуць не можа. Адкрыццё любой, няхай невялікай гандлёвай кропкі патрабуе вялікіх і матэрыяльных, і маральных затратаў. Нас часам ставяць у такія ўмовы, што прыходзіцца, што называецца, весці барацьбу за выжыванне. Вось адзін прыклад. Падсобная гаспадарка ў Гічыцах, дзе працуе і каўбасны цэх. Мясам і каўбаснымі вырабамі мы забяспечваем добрую частку гараджан. Аднак, каб вырабляць гэтую прадукцыю, трэба добра карміць свіней, буйную рагатую жывёлу. Для вытворчасці кармоў патрэбна зямля, а яе (180 гектараў) рашэннем райвыканкама ў лістападзе 1994 года ад нас адабралі. Мы вымушаны закупляць кармы для жывёлы. Гэтае рашэнне я інакш як эканамічна шкодным не назаву, бо карысці ад яго – нуль. Ну, добра, камерсанты, лавачнікі, як нас спрабуюць дзе-нідзе называць, пацярпелі. Дык і насельніцтва раёна ад гэтага таксама пацярпела – няма дадатковых рабочых месцаў для тых, хто б працаваў на гэтай зямлі. Тыя калгасы, да каго перайшлі адабраныя ад нас гектары („Бальшавік", „Савецкая Беларусь") не могуць выкарыстоўваць іх эфектыўна, з прыбыткам з-за аддаленасці зямельных плошчаў, што вядзе да вялікіх транспартных расходаў. Вось і атрымліваецца, што ў нашых магазінах і асартымент мясных вырабаў не пашыраецца, і цана іх не зніжаецца.

– Дарэчы, Уладзімір Аляксеевіч, як вы ацэньваеце стан эканомікі гаспадарак і прадпрыемстваў раёна?

– Ды гэты стан і без мяне даўно ўжо ацэнены. Гэта – крызіс, глыбокі і, лічу, для многіх беззваротны. Аднак і цяпер шляхі з яго выхаду не закрыты. Для прамысловых прадпрыемстваў – гэта пераарыентацыя на выпуск той прадукцыі, якая цяпер мае попыт. Ну, вось прыклад, які ляжыць навідавоку. Мяккія гарнітуры бойкія хлопцы возяць з Польшчы, прадаюць за добрыя грошы і ў Беларусі, і ў Расіі. Дык няўжо мы самі не можам выпускаць гэтыя гарнітуры?

Што датычыць гаспадарак, то без дадатковых грашовых датацый ім, на маю думку, ужо не падняцца. Дзе браць гэтыя грошы – пытанне. Цяперашнія законы ставяць вакол гэтай тэмы высо-окія агароджы. А чаму б не дазволіць тым камерцыйным структурам, якія маюць грошы, укладваць іх менавіта ў сельскую гаспадарку? Чаму б не весці актыўнае акцыяніраванне калгасаў і саўгасаў?

Вядома, гэтыя праблемы павінны вырашацца ў вярхах. Але ж ёсць шмат пытанняў, якія можна і трэба неадкладна разглядаць на месцы. А яны – не вырашаюцца мясцовымі ўладамі. Дазволю сабе яшчэ прывесці прыклад. У райцэнтры ды і ў іншых населеных пунктах ёсць нямала аб'ектаў камунальнай гаспадаркі, якія і не выкарыстоўваюцца, і не прадаюцца. А гэта ж – адзін з метадаў вышуквання грашовых сродкаў, якія можна выкарыстоўваць на вырашэнне сацыяльных праблем. Напрыклад, накіроўваць іх у бальніцы ці школы на харчаванне хворых ці школьнікаў, бо агульнавядома на якім узроўні гэтае харчаванне ажыццяўляецца (дарэчы, райбальніца мае запазычанасць перад нашай фірмай у суме больш за 50 мільёнаў рублёў).

А калі гаварыць канкрэтна, то напомню, як у райцэнтры разабралі былое памяшканне лазні – у раённы бюджэт ад гэтай „акцыі" не паступіла ні капейкі. Ля швейнага атэлье „Стыль" усё „будуецца" памяшканне – чаму б не прадаць яго з аўкцыёна? Па вуліцы Чарткова ёсць недабудаваны магазін. Яшчэ тры месяцы назад фірма падала ў райвыканкам просьбу-заяву аб яго пакупцы. Нам – адмовілі, будынак перададзены райспажыўсаюзу, які і тыя памяшканні, што мае, дрэнна выкарыстоўвае. Не бачна ў такіх дзеяннях логікі, імкнення шукаць выйсця з крызісу. Гэта больш нагадвае імкненне паставіць камерцыйныя структуры ў няроўныя ўмовы існавання ў параўнанні з аб'ектамі дзяржаўнай і кааператыўнай формай уласнасці. Хаця Канст-
туцыя Рэспублікі Беларусь замаца-
ла права ўсіх формаў уласнас-
аднолькавыя, роўныя ўмовы
вання. І я ўсё ж думаю, шт-
гэтае права будзе рэ-
справе, прыйдзе...

Пасля вядомых падзей жніўня 1991 года аб піянер-
...ай арганізацыі ў школе пі-
...рылі нямала. Адны
... дзейнасці ка-
...нак, па-
...не-
...ці і
...а

палітычных партыях і рухах ва ўгоду амбіцыям дарослых.

Здаровы сэнс усё ж перамог. Піянерская арганізацыя атрымала права на жыццё. У верасні 1990 года Х Рэспубліканскі злёт піянераў, які праходзіў у летніку „Зубраня", пацвердзіў сваё жаданне быць самастойнай, добраахвотнай і самадзейнай арганізацыяй. Тады ж быў пры-
...тут, а дзень 13 ве-
...м нараджэння
...нерыі. Адхі-
...ю арыента-
...анізацыя
...іцыць
... і
...у

13 ВЕРАСНЯ – ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПІЯНЕРЫІ

СВЯТА ДЗЯЦЕЙ

васці дзіцяці, адаптацыю растучага маладога чалавека ў складаных умовах сучаснага жыцця, засваенне агульначалавечых каштоўнасцей, выхаванне любві да Радзімы, гатоўнасці да спраў на карысць яе, да дабра.

У нашым раёне піянерскія арганізацыі захаваліся практычна амаль ва ўсіх школах. Практыка іх работы паказвае што найбольш дзейсны-
...ваюць тыя дружыны, у якіх працуюць найбольш адукаваныя, вопытныя важатыя. Важатыя-рамантыкі, калі гаварыць шчыра, здольныя весці за сабою дзяцей.

Ёсць нямала такіх дзіцячых кіраўнікоў-лідэраў у нашых школах. Гэта – Алена Шаўчук з Амяльнянскай СШ, Тамара Папко з Бусяжскай НСШ. Дзеці па-сапраўднаму іх любяць, пад іх кіраўніцтвам вучацца і працаваць, і спяваць, і авалодваць рознымі ўменнямі.

У Дабрамысленскай сярэдняй школе старшай важатай больш за дзесяць гадоў працуе Святлана Канявега. Гэта – чалавек незвычайнай душэўнай дабрыні, шчодрага сэрца, сапраўдны дзіцячы лідэр. Школу тут называюць сталіцай шчаслівага дзяцінства, а савет піянерскай дружыны – штабам ...
кавых спраў і пачынанняў.
... аснову работы дружыны пакладзена Вялікая піянерская гульня. Малодшыя школьнікі аб'яднаны ў „Ордэн рыцараў дабра", больш старэйшыя – у групы даследчыкаў, выпрабавальнікаў. Працуе штаб „Міласэрнасць". Цімураўскімі клопатамі ахоплены 15 інвалідаў і ветэра-

...на
...умє.

заг. ...
Дома ...

НЕ ЖАДАЮ БЫЦЬ БЕДНЫМ

ЯК СТАЦЬ БАГАТЫМ?

Некалі, яшчэ зусім нядаўна, на старонках многіх газет можна было знайсці шмат аб'яў, што прапаноўвалі (вядома, не задарма) мноства рэцэптаў разбагацець. Як паказаў час – усё гэта было, мякка кажучы, падманам. Абяцаем: такога тыпу аб'явы мы друкаваць не будзем. А вось параду, такую, якую аднойчы адзін амерыканскі часопіс даў сваім чытачам, можам працытаваць па памяці. Дык вось, ёсць усяго тры спосабы хутка і законна займець многа грошай.

Спосаб першы: станьце кіназоркай. Не выйшлі тварам? Тады займіцеся спортам і станьце зоркай спартыўнай.

Спосаб другі: напішыце кнігу-бестселер. Прыкладаў мноства. „Тры мушкецёры" там ці „Прыгоды Шэрлака Холмса". Калі не сучасна – звярніце ўвагу на "Эмануэль".

Спосаб трэці: прыдумайце якую-небудзь забаўку. Для прыкладу – кубік Рубіка.

Урэшце, не сярдуйце. Мы не збіраліся з вас кпіць. Проста тры гэтыя напаўжартаўлівыя спосабы яскрава паказваюць, што лёгкіх грошай не бывае. Калі яны на каго і звальваюцца, то, як правіла, у выніку доўгай інтэлектуальнай працы. Ці палова даруецца Богам.

Але... Але вось пра што хочацца сказаць. Бываюць жа і выключэнні. Той жа інжынер Рубік прыдумаў свой кубік, бадай што, выпадкова. У гісторыі вынаходніцтва мноства такіх выпадкаў, калі сам вынаходнік і не думаў нешта падобнае выдумляць. Мы вам зараз раскажам колькі такіх выпадкаў, а вы самі вырашыце – ці змаглі б вы самі нешта такое прыдумаць.

Немец Дзітрыхс, хімік па спецыяльнасці, выпадкова звярнуў увагу на сваю супрацоўніцу, якая напамажвала вусны. З'явіўся аловак, не просты, а якім надта зручна склейваць паперу. Дарэчы, зарабіў той немец на алоўку для склейвання паперы больш за сто сорак мільёнаў.

Француз Жорж дэ Местраль залез аднойчы выпадкова ў дзядоўнік, папляваўся, пакуль пааддзіраў з сябе цэпкае насенне. І ў той жа дзень ідэя была сфармулявана, а хутка ўвесь свет убачыў новы патэнт – знакамітая зараз засцёжка „ліпучка". Сказаць пра грошы? Ад продажу пат…та толькі ў Англію вынаходнік атрымаў пяць мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

А добра вядомы ўсім нам (праўда, больш па тэлевізійнай рэкламе) порысты шакалад? Ягоны вынаходнік за 1994 год атрымаў каля шасцідзесяці мільёнаў.

Але хопіць. Не будзем вас дражніць. Наша рубрыка „Не жадаю быць бедным" зусім не для гэтага. Тут мы будзем расказваць вам пра людзей, якім аднойчы надакучыла атрымліваць зарплату, і яны вырашылі яе зарабляць. Сваімі рукамі, сваей галавой, зусім не па мяху адразу. Пра тых людзей, хто аднойчы, ледзь не сілком, вырваў сябе з сацыялістычнага працоўнага калектыву і стаў сам сабе і рабочым, і кіраўніком. Мы паспрабуем напісаць аб усіх: аб прадпрымальніках, аб гандлярах, аб майстрах сэрвісу і іншых. Вядома, мы не збіраемся ўсіх вас клікаць у „бізнес", кідаць працоўныя месцы. Але мо ёсць сярод вас тыя, хто мае незвычайны талент у нейкай галіне чалавечай дзейнасці, ды не ведае, з чаго пачынаць, не асмельваецца рызыкнуць. Мо расповяды вопытных людзей дапамогуць такім стаць самастойна на ногі.

І яшчэ адна мэта гэтай рубрыкі. Ва ўсім свеце, у любой развітой краіне асаблівая ўвага надаецца так званаму „дробнаму бізнесу". Бо там добра палічылі: гэта – адна з асноў добра працуючай эканомікі. І таму проста неабходна, каб адносіны да такіх людзей у нашым грамадстве не былі адмоўнымі. У нас жа, на жаль, пакуль так.

Будзем спадзявацца – пакуль.

ЗВЫЧАЙНЫ НЕЗВЫЧАЙНЫ МАГАЗІН

Шкада, але што зробіш – ільвіная доля першапачатковай інфармацыі, асабліва раённага маштабу, даходзіць да нас спачатку як чуткі і плёткі. Вось і цяпер. То ў адным, то ў другім месцы загаварылі, ды яшчэ даволі ўзрушана, прыблізна так: недзе там, каля гарадскога Дома культуры, існуе нейкі, бадай што, падпольны магазін. Прадаюць у гэтым магазіне адзенне. Крыху паношанае, але чыстае. Прадаюць не па штуках і парах, а па кілаграмах. Заходзіш, напрыклад, і кажаш: узважце мне, калі ласка, паўкілаграма сарочак, трыста грамаў трусоў, і два кіло паліто зімовага. І адважваюць! А плоціш – смех, капейкі па нашым часе. А адкуль такое дзіва? На вуха шапнуць – распрадаюць гуманітарную дапамогу з Нямеччыны.

Пагадзіцеся, прапускаць такую інфармацыю міма вушэй для газеты – недаравальна. Каб задаволіць асабістую цікавасць і каб раставіць усе кропкі над „і", зайшоў я ў гэты магазінчык. Невялічкі такі пакойчык у сутарэнні Дома культуры. Аздабленне, вядома, не супермаркету „іхняга" гатунку, але даволі чыста і акуратна. Сапраўды – адзенне. Рознае. Добра відаць – нехта яго ўжо насіў. Наўгад, у галаву адразу прыйшло параўнанне з нашымі даўнімі (дарэчы, куды …эта яны зараз падзелі…?) камісійнымі магаз…амі. Памятаеце такія?

…аспадар магазіна – …ады хлопец згадзіўся …казаць на мае пы…

…вось, шаноўныя … паважаныя …ая гэта не …памога. … ўсе … у … За – … й

– Так нельга сказаць. Мы працуем удвух – я і мой сябар, Мяцечка Сяргей. Ён – старэйшы, зараз па справах у Мінску.

– Людзі прызвычаіліся купляць адзенне па штуках, плоцячы за кожную рэч паасобку. А ў вас тут – на вагу...

– Незвычайнага тут нічога няма. Гэта пакуль яшчэ толькі для нас нязвыкла. Такая з'ява – прадаваць ношанае адзенне на вагу – на Захадзе даволі звычайная, там мноства такіх магазінчыкаў. Людзям, што здаюць непатрэбныя рэчы з адзення, плоцяць капейкі, але там жа і капейкі лічыць умеюць. Усё адзенне праходзіць спецыяльную санітарную апрацоўку, мыецца, пакуецца і – на рэалізацыю. Дарэчы, на гэтыя рэчы, што мы прадаем, ёсць спецыяльны сертыфікат.

– Значыць – буржуйскія неданоскі?

– Навошта так... А калі ў камісійных крамах раней куплялі неданоскі савецкія? Хіба вялікая розніца?

– Колькі слоў пра сябе. Любы бізнес – рызыка. Не страшна? Як выспела такое рашэнне?

– Жыццё прымусіла. Скончыў школу тут, у Івацэвічах, адслужыў у войску. Потым паступіў у палітэхнічны інстытут. Лёс так склаўся – ажаніўся, нарадзіўся сын. Вымушаны быў перавесціся на завочнае аддзяленне ў інстытут народнай гаспадаркі. Спрабаваў працаваць, але грошай не хапала катастрафічна, ды яшчэ затрымкі... Нейкі час быў простым „карабейнікам" – вазіў сёе-тое ў Маскву, Пецярбург, вёз нешта адтуль. Але ж увесь час такімі справамі займацца – не імпануе. Хацелася нечага сур'ёзнага, больш сталага.

– І як пачалося?

– Неяк зайшлі з сябрам да сваіх знаёмых у такі вось магазін у Мінску..

– Такія магазіны ёсць у Мінску?

– Ёсць, нават недзе каля дзесяці.

– А дзе яшчэ?

– Ёсць яшчэ ў Кобрыне, Бярозе, Баранавічах. Гэта – што ведаю па вобласці.

– Значыць, зайшлі вы ў такі магазін...

– Вось, зайшлі. Пагледзелі, папыталі, параздумвалі. Справа, здалося, добрая, хоць нам і казалі, што на такім гандлі надта ўжо не разбагацееш. Узялі дзесяць мільёнаў...

– Дзе ўзялі?

– Пазычылі, вядома. Колькі ў родных, колькі ў сяброў. І вырашылі рызыкнуць.

– Цяжка было?

– Вельмі. Не падазравалі нават, што гэтулькі нерваў, часу і грошай прыйдзецца патраціць, каб толькі адчыніцца. Гэтулькі розных папер! Аж паўтара месяцы збіралі ўсё неабходнае. І недзе каля мільёна патрацілі.

– Як працуеце?

– Крыўдаваць грэх. За тыдзень прадаем недзе каля ста пяцідзесяці кілаграмаў рознага адзення. Абарот пакуль не вельмі, як бачыце, вялікі, маленькае памяшканне, ды і грошай пакуль на большае не хапае. Справа гэтая і на самой справе рызыкоўная. Бо атрымліваем, правільней – купляем, мы рэчы запакаванымі, як таго ката ў мяшку. А што там за рэчы – не ведаеш, бо распакоўваць цюкі вагой у тону не дазволіць ніхто. Ды і выбіраць не будзеш – такія правілы. Бярэм усё. Здараецца, што з партыі аж палова ідзе ў брак – ніхто не хоча купляць.

– Куды ідзе нерэалізаванае адзенне?

– Думаем вось сабраць добрую партыю, там ужо назбіралася трохі і ў які дзіцячы дом аддаддзім. Мо можна ж будзе нешта там перашыць, падрамантаваць. Рэчы самі па сабе нядрэнныя, не рабіць жа з іх вялікае вогнішча. Якую частку збіраемся перадаць у царкву, таксама на дабрачынныя мэты.

– Што ў планах на заўтра?

– Працаваць. Зараз вось думаем крыху расшырыцца, у перспектыве – адчыніць такі ж магазін дзе яшчэ. Павялічыцца абарот, зможам уладкаваць на працу колькі чалавек. Створым хоць два-тры працоўныя месцы – для горада гэта ж толькі добра. Далей у планах – заняцца яшчэ і вытворчасцю.

– Значыць, праца на нейкім дзяржаўным прадпрыемстве ці ўстанове не прадбачыцца?

– Тут я магу рэалізаваць сам сябе, свае магчымасці. Вядома – вельмі рызыкоўна. Але мы – гаспадары саміх сябе, сваёй працы. Мяне гэта задавальняе.

– І колькі ж трэба зарабляць для задавальнення?

– Пакуль – нічога. Мы яшчэ толькі-толькі разлічыліся з даўгамі. Амаль увесь прыбытак цяпер ідзе ў абарот, у справу. Сабе бярэм, каб толькі пражыць. Але мы працуем на будучае. Верым, што зможам стаць трывала на ногі.

– Што ж, дзякуй, і поспехаў!

Такая вось у двух маладых хлопцаў справа.

Дарэчы, цэны ў гэтым магазіне такія. Звычайныя штаны тут можна прыдбаць за 20–30 тысяч рублёў, джынсы пацягнуць на тысяч пяцьдзесят-шэсцьдзесят, спадніца ў сярэднім абыдзецца ў чатырнаццаць-дваццаць тысяч. Скураная куртка выйдзе даражэй, недзе на 150 тысяч. Гэта кошт рэчаў якасных, без усялякіх дэфектаў, не надта заношаных. Калі ж дэфекты ёсць, ці тэрмін папярэдняга карыстання значны – кошт рэчы будзе значна ніжэй.

А калі вам даспадобы паштурхацца ў цесным натоўпе, але выбраць нешта адно з вялікай колькасці – прыходзьце ў чацвер. У гэты дзень адбываецца папаўненне асартыменту. Людзей тут бывае аж замнога ў гэты дзень, бо хто-ніхто наспрактыкаваўся ладзіць свой „бізнес" на справе хлопцаў.

А зараз, калі дазволіце, паразважаем крышку.

Мажліва сказаць так: даношваць абноскі чужых буржуяў. Можна сказаць інакш: насіць у будзенны дзень танную рэч, бо выкідваць пэўную суму грошай за новую не дазваляе паўпусты кашалёк і просты здаровы сэнс.

Урэшце, што нас адпужвае (калі каго адпужвае) ад гэтага магазіна? Тое, што рэчы ношаныя? Узгадайце тады былыя камісійныя. Тое, што яны з-за „бугра"? Не, гэта, мабыць, вабіць. А мо тое, што яны – танныя? Мо тое, што яны прадаюцца, як анучы ў анучніка – на вагу? Вось гэта адпужвае, гэта і насцярожвае.

Я нездарма ўспомніў пра нашыя камісійныя магазіны ў мінулым. У большасці рэчы, што прадаваліся там, ужо былі нейкі час у карыстанні. Зрэдку хіба траплялася нешта новае. І ніхто не абражвала заходзіць у такія магазін, нешта там купіць, бо кошт стаяў на кожнай асобнай рэчы, і кошт той быў не на багата меншы, чым новай рэчы ў звычайным магазіне.

Ну, а на тым незразумелым Захадзе вырашылі, што рэчы, быўшыя ў карыстанні, павінны прадавацца па самаму нізкаму кошту. І каб не выдумляць розных там камісій, а потым яшчэ гэтым камісіям і плаціць за кожную ацэненую рэч, вырашылі прадаваць рэчы на вагу. Простая тканіна – адзін кошт, бавоўна – другі, скура – трэці.

У рэшце рэшт, каб існавалі такія прыёмныя пункты ў нас, ці не ператрэслі б вы свае гардэробы, каб пазбавіцца ад сваіх старых, даўно нямодных сукенак? І зрабілі б гэта не дзеля тых невялікіх грошай, а хутчэй, каб вальней стала ў шафе. Ну вось, а там, у той Галандыі прызвычыліся лічыць нават і такія невялікія грошы. І што цікава – больш свае, а не ў чужых кішэнях. Мо таму так і жывуць.

Карацей, кожнаму вырашаць па сваіх думках. Пры мне ў магазіне пабыло чалавек з дзесяць. Хто дзеля цікавасці, як і я, а хто нешта прыдбаць.

І мне здаецца, нядрэнную справу ладзяць гэтыя два маладыя хлопцы. Бо колькі сярод нас сталых і старых адзінокіх людзей, якім на гэты час патр…на менавіта такое – таннае, не абавязкова новае, але яшчэ добрае адзенне. Я памятаю, як …некалькі гадоў таму …рабавалі адчыняць у д…жаўных магазінах „сек…ии для малоимущих". Асартымент складалі пара штаноў ды пантофлі. Трапляліся часам і чаравікі. Дзе яны цяпер, гэтыя секцыі, дзе клопат дзяржавы аб маламаёмных?

У магазіне быў В. ГАПЕЕЎ.

Программа телевидения с 11 по 16 сентября

ПОНЕДЕЛЬНИК, 11

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Короткометражный фильм.
8.30 Финансовое время.
8.45 „Старик и озеро". Док. фильм.
9.10 „Приключения капитана Врунгеля". Мультфильмы 4–6-й.
9.40 „Миколка-паровоз". Худ. фильм.
11.10 Компьютерный полигон.
11.35 Фильм-балет.
12.15 „Звон уходящего лета". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
14.25 „Анне Вески". Фильм-концерт.
14.50 Тэлеанонс.
15.00 Новости.
15.10 „ТАСС уполномочен заявить". Худ. фильм. 5-я серия.
16.20 Белорусская литература. В мире сказки.
16.45 Мультфильм.
17.00 Фильм-канцэрт.
18.00 АТН. Би-би-си, Си-эн-эн
18.45 Телеанонс.
18.50 Музыкальный антракт.
19.00 „На добры лад".
19.15 Белорусский дом.
20.00 Протокол.
20.20 Спортивный телекурьер.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.30 Музыкальный антракт.
21.45 Вертикаль.
22.15 Жан-Поль Сартр. „При закрытых дверях". Спектакль.
0.35 Под куполом Вселенной.

1 канал

6.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 0.05 Новости.
8.20, 17.20 „Тропиканка".
9.10 Поле чудес.
10.00 Человек и закон.
10.25 Мультфильм.
10.35 Огород круглый год.
11.20 Телерадиокомпания „Мир".
15.00 „Отверженные". Мультсериал.
15.25 Звездный час.
16.00 Шпаргалка.
16.05 „Элен и ребята".
16.35 Тет-а-тет.
17.00 Время.
18.15 Хоккей. Чемпионат МХЛ. ЦСКА–„Крылья Советов". В перерыве (19.00) – Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.55 „Двенадцать стульев". Телесериал.
22.20 Версии.
22.40 Футбольное обозрение.
23.10 Пресс-клуб.

Канал „Россия"

17.00 „Лад" – галерея. С. Цыганов.
17.30 Спасение 911.
18.25 Устами младенца.
19.00, 22.00 Вести.
19.25 Подробности.
19.35 „Тайна парковки 5 „в". Худ. фильм сериала „Инспектор Морс". Часть 1-я.
20.40 Репортер.
21.00 Без ретуши.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.40 „Киношок-95".
23.00 „Берлин, Александерплатц". Худ. фильм. 5-я серия.

ВТОРНИК, 12

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Зеркало Си-эн-эн.
8.00 Авто-парк.
8.15 Бездельник.
8.30 Док. фильм.
9.00 Белорусская литература. В мире сказки.
9.25 „Приключения капитана Врунгеля". Мультфильмы 7–10-й.
10.05 „Ко мне, Мухтар!" Худ. фильм.
11.30 Туробъектив.
11.50 „Женщина в белом". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
14.10 Фильм-концерт.
15.00 Новости.
15.10 „ТАСС уполномочен заявить". Худ. фильм. 6-я серия.
16.20 Белорусская литература. Владимир Дубовка и его творчество.
17.00 Фильм-концерт.
17.25 Уроки Н. Новожиловой.
18.00 АТН, Би-би-си, Си-эн-эн
18.45 Телеанонс.
18.50 Музыкальный антракт.
19.00 „Цена долгостроя. Костюковичский цементный завод".
19.20 Мост.
19.50 SOS.
19.55 Экономикст.
20.05 „Моя любовь, моя печаль".
20.35 Скрижали. Князь Кропоткин.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.30 Музыкальный антракт.
21.45 „Мятежный духом".
22.40 Поет Леся Лют.
23.00 Новости.
23.15 Под куполом Вселенной.
23.20 „Влюблённые". Худ. фильм.

1 канал

5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 0.00 Новости.
8.20, 17.20 „Тропиканка".
9.10 Хоккей. Чемпионат МХЛ. ЦСКА – „Крылья Советов". 3-й период. 9.50 В мире животных.
10.25 Мультфильм.
10.35 „Пойми меня".
11.20 Телерадиокомпания „Мир".
15.00 Посмотри, послушай.
15.20 Кактус и К.
15.30 Кварьете „Веселая кампания".
15.40 Волшебный мир, или Синема.
16.00 Очень короткие новости.
16.05 „Элен и ребята".
16.30 Джем.
17.00 Время.
18.10 Час пик. 19.00 Тема.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.55 Из первых рук.
21.05 Футбол. Кубок УЕФА. 1/32 финала. „Спартак-Алания" (Владикавказ) – Ливерпуль (Англия).
22.55 Версии.
23.15 Волейбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Сборная Болгарии – сборная Росси.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.30 Звезды говорят.
7.35 Ритмика.
7.50 Требуются... требуются...
9.55 Телегазета.
10.05 Милицейская хроника.
10.15 Площадь искусств.
10.45 Клип-антракт. И. Аллегрова.
10.50 „Камень сновидений". Мультсериал.
11.15 Новая линия.
15.05 Там-там новости.
15.20 Новая линия.
15.50 Месяцеслов.
16.20 Праздник каждый день.
16.30 Мульти-пульти.
16.40 „Камень сновидений".
17.05 Никто не забыт.
17.10 Торговый дом.
17.25 „Россия. Объяснение в любви".
17.55 На первенстве мира по шахматам.
18.10 L-клуб.
19.25 Подробности.
19.35 „Последние дни Ше Ну". Худ. фильм.
21.25 Астрология любви. И. Понаровская.
22.30 Река времени.

СРЕДА, 13

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Зеркало Си-эн-эн.
8.15 „Моя любовь, моя печаль".
8.45 Мультфильм.
9.00 ТВ – школе. Белорусская литература.
9.40 „Мятежный духом".
10.35 „Приключения капитана Врунгеля". Мультфильмы 11–13-й.
11.05 „Бабушкин внук". Худ. фильм.
12.25 Видимо-невидимо.
13.25 „Полынь – трава горькая". Худ. фильм.
15.00 Новости.
15.10 „ТАСС уполномочен заявить". Худ. фильм.
16.30 „Шостакович – композитор и время".
17.20 Мультфильмы.
18.00 АТН. Би-би-си, Си-эн-эн
18.45 Телеанонс.
18.50 Музыкальный антракт.
19.00 Сельчане. Деловые люди Ивья.
19.30 Кайстра. „На добрый день".
19.55 Экономикст.
20.05 Телеанонс.
20.10 „Моя любовь, моя печаль".
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.30 Музыкальный антракт.
21.45 „АТН-экспертиза".
22.15 „Мятежный духом".
23.05 Новости.
23.20 Под куполом Вселенной.
23.25 Столица. Тележурнал.
23.55 Чемпионат мира по мотогонкам-95.

1 канал

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 1.10 Новости.
8.20, 17.20 „Тропиканка".
9.10 Тема.
9.55 Футбол. Кубок УЕФА. 1/32 финала. „Спартак-Алания" (Владикавказ) – Ливерпуль (Англия). 2-й тайм.
10.35 „Пойми меня".
11.20 Телерадиокомпания „Мир".
15.00 Домисолька.
15.20 Отчего и почему.
15.50 Фан-клуб.
16.00 Шпаргалка.
16.05 „Элен и ребята".
16.30 Тин-тоник.
17.00 Время.
18.10 Час пик.
18.35 „Угадай мелодию".
19.00 Мы.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.55 Москва–Кремль.
21.20 Футбол. Лига чемпионов. „Блэкберн" (Англия) – „Спартак" (Москва).
23.20 Версии.
23.40 Футбол. Лига чемпионов. Обзор 7 матчей.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.30 Звезды говорят.
7.35 Ритмика.
7.50 Требуются... требуются.
7.55 Ключевой момент.
8.05 Пилигрим.
8.50 „Санта-Барбара".
9.40 Крестьянский вопрос.
10.05 Милицейская хроника.
10.15 Телегазета.
10.20 Грета Гарбо. Авторская программа В. Вульфа.
10.50 „Камень сновидений". Мультсериал.
11.15 Новая линия.
15.05 Там-там новости.
15.20 Праздник каждый день.
15.30 Дальний Восток.
16.20 „Камень сновидений". Мультсериал.
16.45 Непопулярная тема.
17.00 Поют драматические актеры.
17.30 Я – лидер.
17.55 На первенстве мира по шахматам.
18.10 Эксповидео.
18.25 Своя игра.
19.25 Подробности.
19.35 „Санта-Барбара".
20.30 „Городок".
21.05 Клуб губернаторов.
21.45 Экран криминальных сообщений.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.40 „Киношок-95".
23.00 „Берлин, Александерплатц". Худ. фильм.

ЧЕТВЕРГ, 14

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Зеркало Си-эн-эн.
8.15 „Моя любовь, моя печаль".
8.45 Мультфильмы.
9.20 „Мятежный духом".
10.15 „Питер Пэн". Худ. фильм. 1-я серия.
11.25 Уроки Н. Новожиловой.
11.55 „Татуированная роза". Фільм-спектакль. 1-я и 2-я серии.
14.15 Фильм-концерт.
15.00 Новости.
15.10 „ТАСС уполномочен заявить". Худ. фильм.
16.20 ТВ – школе. Белорусская литература.
16.45 Мультфильмы.
17.30 Фильм-концерт.
18.00 АТН, Бт-би-си, Си-эн-эн
18.45 Телеанонс.
18.50 Музыкальный антракт.
19.00 Темная комната. „Шварцарбайтер".
19.30 Крок. „Своевременно".
20.00 „Моя любовь, моя печаль".
20.30 Студия „Эксклюзив".
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.30 Музыкальный антракт.
21.45 Студия „Политика".
22.00 Экономикст.
22.10 „Мятежный духом".
23.05 Новости.
23.20 Под куполом Вселенной.
23.25 „Дрянь". Худ. фильм.

1 канал

5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 23.55 Новости.
8.20, 17.20 „Тропиканка".
9.10 Футбол. Лига чемпионов „Блэкберн" (Англия) – „Спартак" (Москва).
11.20 Телерадиокомпания „Мир".
15.00 Мультитролия.
15.20 На балу у Золушки.
15.40 Компьютер-холл.
16.00 Очень короткие новости.
16.05 „Элен и ребята".
16.30...До и старше.
17.00 Время.
18.10 Час пик.
18.35 Лотто-миллион.
19.00 Футбол. Лига чемпионов „Динамо" (Киев) – „Панатинаикос" (Греция). 2-й тайм.
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 „Подсматривающий". Худ. фильм.
22.50 Версии.
23.10 Волейбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Сборная России – сборная Италии.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.30 Звезды говорят.
7.35 Ритмика.
7.50 Требуются... требуются...
7.55 Ключевой момент.
8.05 „Человек, который сломал радугу". Док. фильм.
8.45 Телегазета.
8.50 „Санта-Барбара".
9.40 Крестьянский вопрос.
10.05 Милицейская хроника.
10.15 Партия халявы.
10.35 Музыкальный экспромт
10.45 „Камень сновидений". Мультсериал.
11.10 Никто не забыт.
11.15 Новая линия.
15.05 Там-там новости.
15.20 Праздник каждый день.
15.30 Разноцветная призма.
16.20 „Камень сновидений".
16.45 „Здравствуй, племя молодое, незнакомое..." Навстречу Всеросийскому совещанию молодых писателей.
16.55 Футбол. Кубок кубков. 1/16 финала. „Динамо" (Москва) – „Арарат" (Ереван).
19.25 Подробности.
19.35 „Санта-Барбара".
20.30 В мире авто-и мотоспорта.
21.05 Армия-95.
21.50 Клип-антракт. И. Салтыкова.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.45 Экран криминальных сообщений.
22.55 Питер Хэммил в Москве.

ПЯТНИЦА, 15

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Зеркало Си-эн-эн.
8.15 „Моя любовь, моя печаль".
8.45 Мультфильм.
9.00 ТВ – школе. Белорусская литература.
9.25 „Мятежный духом".
10.20 Мультфильмы.
11.00 „Питер Пэн". Худ. фильм. 2-я серия.
12.10 Фильм-концерт.
12.40 „Запомните меня такой". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
15.00 Новости.
15.10 „Дворянское гнездо". Худ. фильм.
16.55 „Карадаг – земля заповедная", „Акварели Волошина". Док. фильм.
17.35 „Все обо всем". Программа для детей.
18.00 АТН, Би-би-си, Си-эн-эн
18.45 Телеанонс.
18.50 Музыкальный антракт.
19.00 Трудоустройство за пределами Беларуси.
19.30 Премьера цикла. „Новости-ТВ".
19.45 SOS.
19.50 Диалоги о спорте.
20.10 Многозвучие.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.30 Музыкальный антракт.
21.45 Экономикст.
21.55 „Вспышка". Худ. фильм. В перерыве – Новости.
23.45 Под куполом Вселенной.
23.50 Фильм-концерт.

1 канал

5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 1.10 Новости.
8.20, 17.20 „Тропиканка".
9.10 Мы.
9.50 Клуб путешественников.
10.35 „Пойми меня".
11.20 Телерадиокомпания „Мир".
15.00 „Белый клык".
15.25 Созвездие Орфея.
15.35 Новая реальность.
16.00 Шпаргалка.
16.05 Рок-урок.
17.00 Время.
18.10 Дикое поле.
18.25 Человек и закон.
18.55 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.55 Премьера сериала „Рейли – король шпионов".
22.25 Версии.
22.45 Взгляд.
23.40 Волейбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Полуфинал.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.30 Звезды говорят.
7.35 Ритмика.
7.50 Требуются... требуются...
7.55 Совершенно секретно.
8.45 Клип-антракт. Линда.
8.50 „Санта-Барбара".
9.40 Крестьянский вопрос.
10.05 Милицейская хроника.
10.15 Телегазета.
10.20 Док. фильм.
10.30 Торговый дом.
10.45 Мировая деревня. „Русская свадьба".
11.15 Новая линия.
15.05 Там-там новости.
15.20 Праздник каждый день.
15.30 Кенгуру.
15.50 Месяцеслов.
16.20 Полеты Лены Радишевской.
16.35 На первенстве мира по шахматам.
16.50 „Зорро". Худ. фильм.
17.45 Мастер. Кирилл Лавров.
18.25 Правительственные будни.
19.25 Подробности.
19.35 „Санта-Барбара".
20.30 Сам себе режиссер.
21.05 „К-2" представляет.
22.30 Река времени.
22.35 Автомиг.
22.45 „Киношок-95".

СУББОТА, 16

Белорусское телевидение

8.00 Экономикст.
8.10 Зеркало Си-эн-эн.
8.25 Фильм-концерт.
8.55 Спортплощадка.
9.30 Сущность.
10.20 Телефестиваль творчества инвалидов.
10.40 Здоровье.
11.10 „Все обо всем".
11.30 „Мама". Худ. фильм.
12.55 Мультфильмы.
13.20 Дни Белорусской письменности и печати.
13.35 „Свояки. Тропинку эту не теряем".
14.05 „Вера, Надежда, Любовь".
14.50 „Черная роза – эмблема печали, красная роза – эмблема любви".
17.05 Концерт.
17.45 „Тропическая жара".
18.45 „Универсиада по-белорусски".
19.25 Финансовое время.
19.40 „Галерея".
20.05 Международные спортивные новости.
20.35 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.35 „Нелюдь, или В раю запрещена охота". Худ. фильм

1 канал

6.30 Телеутро.
7.45 Слово пастыря. Митрополит Кирилл.
8.00, 14.00, 0.40 Новости.
8.20 Лего-го.
8.50 „Секреты моего лета". Телесериал для детей.
9.15 Мультфильм.
9.25 Утренняя почта.
10.00 Смак. 10.20 Здоровье.
10.50 Вся Россия.
11.20 Бомонд.
11.40 Исторический фильм
13.25 Зеркало.
14.20 Большие гонки.
14.50 Валерий Леонтьев по дороге в Голливуд.
15.10 Фильм-сказка.
16.20 В мире животных.
17.00 Время.
17.20 Смехопанорама.
18.10 „Следопыт".
19.45 Спокойной ночи. малыши!
20.00 Время.
20.55 „Рейли – король шпионов".
21.55 Брейн ринг.
22.40 У всех на устах.
23.10 Волейбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Финал.

Канал „Россия"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 Звезды говорят.
7.30 Клип-антракт.
7.35 От „Винта".
7.50 Продленка.
8.05 „Давным-давно".
8.35 Пилигрим.
9.20 Золотая шпора.
9.50 „Чисто английский ре[illegible] портаж".
10.00 Соотечественники.
10.45 „Вечерняя шк[illegible] Худ. фильм.
12.55 Клип-антракт.
13.20 Де факто
13.35 „Уме[illegible] убила". Х[illegible]
14.20 Кино[illegible]
14.35 „П[illegible] кову"
15.25 [illegible] лове[illegible]
15.5[illegible]
Рос[illegible]
17.5[illegible] шах[illegible]
18.05 [illegible]
19.25 [illegible] е жи[illegible]
22.30 [illegible]
22.35 [illegible]

Газета выдаецца на беларускай і рускай мовах. Набіраецца ў Івацэвічах, друкуецца ў Баранавіцкай друкарні (г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80).
Фармат 420х300 мм. Аб'ём – 1 друк. аркуш.
Падпісана да друку 7 верасня ў 14.00.

ЗАСНАВАЛЬНІК: гандлёва-прамысловая фірма „Івацэвічы" Рэгістрацыйны нумар 1147.

Рэдактар Лідзія [illegible]

НАШ АДРАС: 225250, г. Іва[illegible] ва, 5, рэдакцыя „Газеты Улад[illegible] Тэлефон 2-12-09.

Рукапісы і здымкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні і выказванні могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязацельстваў.